23 ЛІПЕНЯ 1999г. ПЯТНІЦА

НАВІНЫ

№82 (613) КОШТ СВАБОДНЫ



Лукашенко лишается фактического международного признания

Иван БАБИЧЕВ

Международная реакция на окончание президентских полномочий Лукашенко была довольно резкой. Громче всех 20 июля высказался по этому поводу Госдепартамент США.

ЗАЯВЛЕНИЕ ПРЕСС-СЕКРЕТАРЯ ГОСДЕПАРТАМЕНТА США ДЖЕЙМСА РУБИНА

Окончание срока законного нахождения на посту белорусского Президента Лукашенко сегодня еще раз подчеркивает необходимость выхода страны из конституционного тупика. Режим Лукашенко несет ответственность за это положение, которое стало результатом изменений, внесенных г-ном Лукашенко в белорусскую Конституцию в результате неконституционного референдума 1996 г. Этот референдум получил широкое осуждение международного сообщества. Упомянутые изменения, а также самовольное продолжение срока полномочий после 20 июля 1999 г. и подавление высказываемых протестов еще больше подорвали демократическую легитимность Лукашенко и противоречат демократическим принципам, на которых он избирался.

Легитимность Лукашенко как избранного представителя белорусского народа может быть возобновлена только через свободные и справедливые демократические выборы, в которых все политические партии могли бы принять участие на равноправной основе. Верховный Совет, который Соединенные Штаты и большинство стран международного сообщества по-прежнему продолжают признавать единственным законным парламентом Беларуси, имеет право обратиться со своей позицией к жителям Беларуси. Это право надо уважать. Мы снова призываем правительство Беларуси начать диалог с оппозицией без всяких предварительных условий и обеспечить выполнение международно признанных прав человека. Только через диалог и уважение к правам человека Беларусь может вернуться на путь демократии и занять свое законное место в международном сообществе.

Отвечая на вопросы журналистов во время брифинга 21 июля, Рубин сказал буквально следующее:

– Собираются ли США прибегнуть к практическим мерам – отзыв посла, наложение санкций или нечто в этом роде?

– Фактически мы будем продолжать работу с режимом Лукашенко, несмотря на то, что в наших глазах он больше не является демократически избранным легитимным президентом... Мы будем осуществлять контакты на уровне де-факто, но это вовсе не означает принятия нами его легитимности. Неуважение президентом Лукашенко прав человека и демократии давно стало камнем преткновения в наших двусторонних отношениях. До тех пор, пока не произойдет улучшений в этом направлении, наша политика «избирательного вмешательства» будет в силе. ►

Окончание на стр.7

Першы дзень свабоды

У сераду ў Мінску прайшло святкаванне заканчэння прэзідэнцкіх паўнамоцтваў Аляксандра Лукашэнкі

Расціслаў ПЕРМЯКОЎ
Аляксей ШЫДЛОЎСКІ

Як вядома, беларуская Канстытуцыя дае магчымасць прэзідэнту кіраваць краінай на працягу пяці гадоў. 20 ліпеня гэты тэрмін для Лукашэнкі скончыўся. Шмат людзей неўпадабалі ягонае кіраўніцтва. Таму заканчэнне ягоных паўнамоцтваў сталася сапраўдным святам для многіх беларусаў.


Да акцыі, якую так доўга чакалі і на якую былі ўскладзеныя вялікія спадзяванні апазіцыі, улады падрыхтаваліся сур'ёзна, і гэта было бачна ўжо прыкладна а 9-ай гадзіне раніцы. У гэты час у двары жылых дамоў у цэнтры горада заязджалі аўтобусы з амонаўцамі, грузавікі, вадамёты і іншая спецтэхніка. Толькі ў раён Кастрычніцкай плошчы было сцягнута некалькі тысяч міліцыянтаў і байцоў унутраных войскаў.

А 17-ай гадзіне на Кастрычніцкай плошчы сабралася 5-6 тысяч жадаючых узяць удзел ва ўрачыстым святкаванні. Сцягоў і плакатаў амаль не было, і таму акцыя выглядала як масавыя гулянні, на якія дазвол уладаў не патрэбны. На працягу гадзіны людзі чакалі, калі пачнецца дзеянне.

А 18-ай людзі па ходніках пайшлі на плошчу Незалежнасці. Дэманстранты некалькі разоў прайшліся вакол галоўнай плошчы Мінска і нават крыху пасядзелі проста на зямлі, спрабуючы тым самым утварыць нейкі прэцэдэнт «сядзячай акцыі». У хуткім часе з'явілася інфармацыя, што Вярхоўны Савет сабраўся ў будынку на вуліцы Карла Маркса, дзе раней размяшчалася Вышэйшая партыйная школа, а цяпер – філфак БДУ, у нейкіх 300 метрах ад рэзідэнцыі Лукашэнкі. Натоўп рушыў туды, каб падтрымаць прадстаўнікоў заканадаўчай улады.

Дэпутаты Вярхоўнага Савета 13-га склікання прызначылі сваё паседжанне, каб увянчаць народную акцыю і засведчыць пераход улады да апазіцыйнага парламента як да адзінага легітымнага органа ўлады ў Беларусі. Парламентарыі збіраліся ў цэнтры горада канспіратыўна, па два-тры чалавекі на «кропку». Пасля маленькімі групкамі кіраваліся на вул. К.Маркса.

Вярхоўны Савет абмяркоўваў пытанні пра намеснікаў старшыні і членаў Прэзідыума ВС, а таксама пра палітычную сітуацыю ў Беларусі і захады па перадольванні крызісу ўлады ў краіне. Першым намеснікам старшыні ВС на паседжанні быў абраны Віктар Ганчар. Гэта значыць, што менавіта ён стане выконваючым абавязкі кіраўніка заканадаўчай улады, калі Сямён Шарэцкі возьме на сябе абавязкі прэзідэнта. Акрамя таго, дэпутаты прынялі зварот да беларускага народа. Потым дэпутаты стварылі мандатную камісію, якая мусіць пацвердзіць паўнамоцтвы кожнага дэпутата. Пасля гэтага дэпутаты перапынілі сваю працу «на няпэўны тэрмін» і пакінулі універсітэцкі корпус. Мандатная камісія ўсю ноч на канспіратыўнай кватэры працягвала сваю працу.


Фота IREX/ProMedia

● Супрацьстаянне на Кастрычніцкай плошчы


Фота Ул.ШЛАПАКА

● Дэманстранты сутыкнуліся з кардонам у квартале ад рэзідэнцыі прэзідэнта


Фота Ул.ШЛАПАКА

● Сямён Шарэцкі ў атачэнні аховы

Уся вуліца перад будынкам філфака была запруджаная народам. Людзі чакалі ад Вярхоўнага Савета інфармацыю пра тое, што цяпер адбываецца ў краіне. Чакалі і выступу новаспечанага прэзідэнта Шарэцкага. Пры гэтым вялікая частка прысутных прагнула толькі двух словаў Сямёна Георгіевіча: «На рэзідэнцыю!», каб змясці з дарогі выстраеныя ля будынка Канстытуцыйнага суда кардоны. Аднак Шарэцкі ўжо паспеў з'ехаць таксама на канспіратыўную кватэру. Замест яго перад двух-трохтысячным натоўпам выступіў Віктар Ганчар, якога сустрэлі бурнымі апладысментамі. Пасля выступлення Ганчар і група дэпутатаў павялі людзей на Кастрычніцкую плошчу.

Усе падыходы да прэзідэнцкай рэзідэнцыі былі заблакаваныя амонаўцамі ў спецабмундзіраванні – у шлемах і са шчытамі. Тым не менш, сілавыя структуры не змаглі перашкодзіць людзям дайсці да плошчы, дзе адбыўся мітынг.

Правядзенне мерапрыемства было ўскладненае адсутнасцю гукаўзмацняльнай тэхнікі. Выконваючы абавязкі старшыні БНФ Сяргей Папкоў адмовіўся выдаць дэманстрантам мегафоны. Праўда, пазней мегафоны знайшліся, і прамовы апошніх выступоўцаў ужо гучалі на ўсю плошчу.

Людзі разыходзіліся з пачуццём свята – скончыўся першы дзень свабоды, першы дзень без Лукашэнкі. ■

ГАРАЧАЯ ЛІНІЯ

За незалежнасць!

Беларуская сацыял-дэмакратычная партыя (Народная Грамада) атрымала ў Мінгарвыканкаме дазвол на правядзенне 27 ліпеня шэсця і мітынгу. Акцыя прысвечаная 9-ай гадавіне абвяшчэння незалежнасці Беларусі і скіраваная супраць узурпацыі ўлады былым прэзідэнтам краіны Лукашэнкам. Збор удзельнікаў прызначаны а 18-й гадзіне на плошчы Якуба Коласа.

Аляксей ШЫДЛОЎСКІ

Дзяржава не плаціць заробкі сялянам

Паўтрыльёна рублёў завінавацілася дзяржава працаўнікам сяла. Пра гэта ўчора паведаміў А.Лукашэнка падчас селектарнай нарады, прысвечанай арганізацыі ўборкі і праблемам аграпрамысловага комплексу. Ён патрабаваў ад урада пагасіць гэтую запазычанасць на працягу тыдня. А інакш — ... самі ведаеце што.

Да сяброў у Ірак

Віцэ-прэм'ер беларускага ўрада Уладзімір Замяталін у сераду адбыў з дзесяцідзённым візітам у Ірак. Там ён будзе займацца развіццём двухбаковага супрацоўніцтва. Прадугледжваецца, што У.Замяталін сустрэнецца з прэзідэнтам Ірака.


Заступіліся

Сем буйнейшых праваабарончых арганізацыяў ЗША звярнуліся да віцэ-прэзідэнта Эла Гора наконт сітуацыі ў Беларусі. Яны нагадалі яму пра самыя гучныя факты парушэння правоў чалавека ў нашай краіне і падтрымалі сённяшняе крытычнае стаўленне ЗША да беларускага рэжыму.

Падрыхтаваў Расціслаў ПЕРМЯКОЎ

наша свабода

НАДВОР'Е



24 ліпеня па рэспубліцы чакаецца пераменная воблачнасць, па большай частцы тэрыторыі, а ў **Гродзенскай** і днём у **Брэсцкай** абласцях месцамі кароткачасовыя дажджы, навальніцы, вецер паўднёвы з пераходам у заходні, 6—10 м/сек., пры навальніцах — 15—20 м/сек., па **Гродзенскай** вобласці — да 14 м/сек. Тэмпература ноччу 10—15 градусаў.

Курс наяўнага долара на «чорным рынку»

440 000

ПЯТНІЦА



З МІКАЛАЕМ ХАЛЕЗІНЫМ

Паралич

Как вы думаете, о чем сейчас думает Он? О «Славянском базаре»? О невыплаченных пенсиях? О погибшем урожае? Нет. Он думает совсем о другом.

— Они меня убьют. Вот и Шейман говорит, что заговоры где-то совсем рядом. Кошмар... Надо что-то делать. Надо кого-то арестовать. Кого? Хрен его знает кого. Оппозицию сейчас трогать нельзя — вмиг американцы войска из Косова перебросят. Кого?.. Кого?..

Почему эти сволочи из Верховного Совета смогли 21 июля провести заседание в центре города? Захватили здание филологического факультета БГУ? Как можно здание захватить? Нет, кто-то им это здание предоставил... Кто?.. Кто?.. Кто-то из моего окружения работает против меня. Кто? Мясникович? Латыпов? Сиваков? Кстати, Сиваков мне конкурент — генерал, харизматик, хитрец. Настоящий диктатор. Ходит в полевой форме. От этого можно ждать чего угодно. Перебежит в оппозицию — конец.

Гады! Кругом гады. Ненавидят меня, а в глаза врут, что любят. Что делать?.. Референдум? Нет, какой к черту референдум — его же никто не признает. Ельцин продал. Обещал же к 1 июля объединиться... Продал. Телеканалы свои против меня настроил. Теперь начнут орать...

Латыпов говорил, что заявления евроструктур — это ерунда. Ложь!.. Ложь!.. Какая ерунда? Они же однозначно сказали — выборы. Какие выборы? Если бы сегодня, то может и выиграл бы, а через три месяца? Нет. Нельзя. Надо держаться до конца.

Надо подумать. Что, если ни на что не обращать внимания? Все затихнет и будет как раньше. Народ не поддержал оппозицию. Они же власть не захватили в первый день... Ерунда! Ничего не затихнет. 27 июля они опять на улицу повалят — день их независимости. Гады. Надо остановить, пока их не стало 100 тысяч. Заметалин говорил, что у народа апатия. Это, блин, по БТ апатия, а по российским каналам посмотри — они будто с цепи сорвались.

Надо что-то делать. Нельзя бездействовать — подумают, что боюсь. Не боюсь... Не боюсь... А-а! Страшно! Они же могут меня убить! Никому нельзя верить. Уехать? Но куда? Западники сдадут — там не откупишься. Слободан, Саддам? Нет... В Россию. Боря возьмет. Жить будет где — деньги есть. Да, в Россию. Успею... Наверное.

АКЦЫЯ ДНЯ

Гной для Лукашэнкі

Расціслаў ПЕРМЯКОЎ

Самую экзатычную — і ўдалую — акцыю па святкаванні заканчэння прэзідэнцкіх паўнамоцтваў Аляксандра Лукашэнкі правёў мастак Алесь Пушкін. Ён прывёз у падарунак Аляксандру Рыгоравічу тачку з гноем і аксесуарамі, што сімвалізуюць ягонае праўленне.

Роўна ў 12:00 Алесь Пушкін у традыцыйнай беларускай кашулі з'явіўся перад прэзідэнцкай рэзідэнцыяй з чырвонай тачкай і ў белых пальчатках. На тачцы сярод свежага гною ляжалі: святочны партрэт Лукашэнкі, плакат рэферэндуму «Прошу вашей поддержки», вернутая сімволіка БССР, новыя грашовыя купюры (надрукаваныя за час кіравання праўлення — 100.000, 500.000, 1.000.000 беларускіх рублёў), наручнікі і ланцугі.

Усё гэта было вывалена акурат перад галоўным уваходам у будынак адміністрацыі прэзідэнта, пасля чаго Пушкін урачыста віламі праткнуў выяву Лукашэнкі. Ён заявіў журналістам, што ўся акцыя была задуманая і спланаваная загадзя як пэрфоманс «Падзяка ППРБ за пяцігадовую кіпучую цяжкую выніковую працу дзеля народа», які носіць чыста нацыянальную і мірную афарбоўку.

Мастак так растлумачыў сімволіку акцыі: «Тачка з гноем ёсць самаізаляванасць наша краіны ў цяперашні час, асноўны наш набытак і багацце. Бо больш нічога не засталося. Гэтая тачка з гноем ёсць вынік пяцігадовай мэтанакіравана-тупіковай палітыкі вышэйшай выканаўчай улады прэзідэнта, яго марыянетачнасці Маскве. Кошт збяднелай Беларусі, якую за гэтую цану прыдбае нехта. Але гэты вобраз мае аптымістычны, станоўчы сэнс, бо гэта тое, што ўгноіць далейшыя парасткі дэмакратыі, з гэтага вырасце Новая Беларусь. Вобразы асноўных набыткаў праўлення ППРБ — плакаты з словамі «Прошу вашей поддержки», сімвал рэферэндумаў, дзе былі пахаваны бел-чырвона-белы сцяг, герб Пагоня, мова, нацыянальныя святыні. Наручнікі і ланцугі — вобразы палітыкі страху, на чым трымаецца рэжым. Купюры — набытак інфляцыі, крызісу цэнаў».

Адразу пасля заканчэння акцыі да Алеся Пушкіна наблізіліся два міліцыянты, якія вельмі нясмела паспрабавалі затрымаць мастака. Той не паддаваўся. Тады з будынка рэзідэнцыі выйшаў ахоўнік, які стаў прасіць Пушкіна «прыбраць за сабой». Марна. У рэшце рэшт да рэзідэнцыі пад'ехаў міліцэйскі «бобік», і мастака сілай звезлі ў пастарунак.

Як паведамілі нам учора ў прэс-цэнтры ГУУС Мінгарвыканкама, супраць А.Пушкіна была ўзбуджаная крымінальная справа па ч.2 артыкула 201 «злоснае хуліганства». Гэты артыкул прадугледжвае адказнасць ад 1 да 5 гадоў турэмнага зняволення. Сам Алесь Пушкін быў выпушчаны на волю пад падпіску аб нявыездзе. ■



Фота Ул. ШЛАПАКА

АРЫШТЫ

53 узника совести

Наталья РАДИНА

По данным пресс-службы Управления внутренних дел, 21 июля во время «проводов» Лукашенко было задержано 53 человека. Все они автоматически признаны Международной Амнистией узниками совести. Странное совпадение: ровно столько людей погибло во время трагедии на станции метро «Немига»...

Поскольку откровенных нарушений правопорядка со стороны протестующих не было, милиция в начале акции протеста предпочитала хватать людей поодиночке. Журналиста Тимофея Дранчука задержали у концертного зала «Минск», когда он пытался снимать на видеопленку размещенные у здания автобусы с предназначенными для подавления демонстрантов служащими внутренних войск. Парня отвезли за пять километров от города, где избили и отобрали видеокассету. Наш журналист (газета НАВІНЫ) Алексей Шидловский пострадал у входа в сквер возле театра Янки Купалы, который был оцеплен милицией якобы с целью охраны отдыха горожан.

Произошел инцидент с активистом Молодого Фронта Евгением Скочко, которого пытались схватить двое неизвестных в штатском. Однако мы не можем с полной уверенностью утверждать, что неизвестные имели отношение к органам правопорядка.

Редактора газеты «Имя» Ирину Халип задержали около управы Белорусского Народного Фронта, куда она отвозила почувствовавшего себя плохо человека. Халип отвезли в РОВД, но вскоре отпустили.

Журналиста из Солигорска Омельченю схватили в то время, когда он фотографировал размещенные вокруг Октябрьской площади подразделения ОМОНа. Ему разбили фотоаппарат и отвезли в РОВД.

В регионах, где проходили несанкционированные пикеты, также было немало задержанных. В Гродно были арестованы 6 человек. В Бресте задержан председатель городской организации БНФ Сергей Божик. Пятеро брестчан были задержаны в Минске на железнодорожном вокзале, буквально при выходе из поезда. Они ехали поддержать митингующих...

Массовый захват демонстрантов начался, как обычно, поздним вечером, когда они стали расходиться по домам. В метро стояли наряды милиции, которые, пользуясь явным количественным преимуществом, хватали людей, шедших малыми группами или по одному.

22 июля прошли суды над задержанными. Пока известно, что наблюдателей из правозащитного центра «Весна-96» в залы суда не пускали... ■

ПРАВІНЦЫЯ

Гродзенскія праводзіны

Сяргей АСТРАЎЦОЎ

У дзень «праводзінаў прэзідэнта» гродзенцы зрабілі паломніцтва па мясцінах горада, звязаных з імем А.Лукашэнкі, а напрыканцы ўтапілі ў Нёмане сцяг з арнаментам, у які загарнулі камень.

На праводзіны гараджане сабраліся ў цэнтры горада на пляцы Леніна. Шмат хто ўпрыгожыўся бел-чырвона-белымі банцікамі. Баян зайграў «Развітанне славянкі» ды іншыя мелодыі. Міліцыя па сваёй завядзёнцы спачатку затрымала кіраўніка гарадской арганізацыі БНФ С.Мальчыка, які трымаў газетныя карыкатуры на ўчарашняга прэзідэнта. Сп. Мальчыка неўзабаве выпусцілі.

Удзельнікі «праводзінаў» накіраваліся пад беларускімі сцягамі да Палаца культуры тэкстыльшчыкаў, у якім Лукашэнка выступаў пяць гадоў таму. На тых самых прыступках, з якіх некалі прамаўляў будучы прэзідэнт, гродзенцы заявілі, што ягонае прэзідэнцтва закончылася. Затым удзельнікі пайшлі да драмтэатра, дзе Лукашэнка таксама выступаў разы два-тры. Менавіта тут напачатку сакавіка мінулага года ён упершыню афіцыйна заявіў, што прэзідэнцкіх выбараў у 1999 годзе не будзе. Паход гродзенцаў, якіх сабралася блізу дзвюх тысяч, закончыўся на беразе Нёмана цырымоніяй «развітання з нячыстай сілай», якая панавала на Беларусі апошнім часам.

Пазней міліцыяй былі затрыманыя кіраўнікі гарадской арганізацыі БНФ С.Мальчык, А.Астроўскі, К.Жынь, а таксама М.Воран, Я.Лілевіч і галоўны рэдактар газеты «Пагоня» М.Маркевіч. Яны атрымалі позвы ў суд. Над А. Астроўскім лукашэнкаўскі суд ужо адбыўся — яму прызначана пакаранне ў 200 мільёнаў рублёў. ■

СУДОВЫ ПРАЦЭС

Андрэя Клімава пачалі судзіць

Яшчэ да пачатку працэсу ў будынку суда проста на вачах у кіраўніка місіі АБСЕ быў затрыманы дэпутат Шчукін і збіты дэпутат Анатоль Лябедзька

Альгерд НЕВЯРОЎСКІ

Учора ў Ленінскім райсудзе Мінска распачаўся судовы працэс над дэпутатам ВС, вядомым прадпрымальнікам Андрэем Клімавым, які вось ужо паўтара года знаходзіцца ў турме па абвінавачванні ў эканамічных злоўжываннях.

Судоваму пасяджэнню папярэднічаў брыдкі спектакль, разыграны ў будынку суда міліцыянтамі. Нейкі падпалкоўнік аддаў сваім падначаленым загад затрымаць вядомага праваабаронцу і журналіста, дэпутата ВС Валерыя Шчукіна, які збіраўся асвятляць ход працэсу над Андрэем Клімавым. У калідоры суда на той момант сабралася ўжо шмат людзей, і ахоўнікі парадку ніяк не маглі адважыцца схапіць Шчукіна. Аднак падпалкоўнік заявіў, што Шчукін абвінавачваецца ў парушэнні грамадскага парадку і ўдзеле ў несанкцыянаванай акцыі («Прэзідэнцкія провады 21 ліпеня») і паўторна загадаў сваім сяржантам схапіць апазіцыянера. Тыя загад выканалі: адштурхнуўшы ў бок кіраўніка кансультатыўна-назіральнай групы АБСЕ ў Мінску Ханса Георга Віка, які спрабаваў заступіцца за Шчукіна, ахоўнікі парадку павалаклі барадатага праваабаронцу ўніз па сходах.

Дасталося ад раз'юшаных сяржантаў і дэпутату ВС Анатолю Лябедзьку, які спрабаваў пратэставаць супраць такога абыходжання са сваім калегам-парламентарыем — міліцыянты парвалі Лябедзьку кашулю. Шчукіна ж даставілі ў гарадзкі аддзел міліцыі, дзе над ім адбыўся суд. Дэпутат атрымаў 15 сутак арышту нібыта за «дробнае хуліганства».

А суд над Андрэем Клімавым і 8-мю яго калегамі па будаўнічай фірме пачаўся ў даволі цяжкай абстаноўцы. Маленькая зала пасяджэнняў ледзь змясціла ўсіх удзельнікаў працэсу. Суддзя Тупік пачала працэс са звычайных фармальнасцяў — 9 падсудных па чарзе называлі сябе. Андрэй Клімаў выступіў з хадайніцтвам, у якім папярэдзіў суддзю, пракурора Радкевіч і народных засядацеляў аб адказнасці за супрацьпраўныя дзеянні. Па словах Андрэя, ён валодае дэпутацкім імунітэтам, і таму ў будучыні дзеянні суддзяў і пракурора ў супраць яго могуць трактавацца як спрыянне былому прэзідэнту ў незаконным захопе ўлады. Пасля Клімаў і яго адвакат Вольга Біруля прадставілі суду хадайніцтва аб уключэнні ў склад абароны вядомага адваката Гары Паганяйлы. Аднак суддзя адмовіла ў гэтым, бо, па словах пракурора Радкевіч, Паганяйла пазбаўлены адвакацкай ліцэнзіі. Тым не менш не выключана, што пазней Гары Пятровіч выступіць у ролі грамадскага абаронцы Клімава, а яшчэ адным абаронцам будзе выступаць маці Андрэя.

Пасля са сваімі хадайніцтвамі выступілі іншы падсудны, Леанід Ваўковіч, які таксама, як і Клімаў, сядзіць у СІЗО з 12 лютага 1998 года. Ваўковіч скардзіўся суду на незаконныя дзеянні следчых і генпракурора Алега Бажэлкі, які беспадстаўна працягнуў санкцыю на арышт. А таксама прасіў суд змяніць яму меру стрымання ў сувязі з дрэнным станам здароўя. Цяпер суд аб'явіў перапынак для разгляду хадайніцтва. Аднак працэс над А.Клімавым, які ўжо даўно прызнаны палітычным вязнем, на думку многіх назіральнікаў, расцягнецца на некалькі месяцаў. Справа ў тым, што толькі матэрыялы гэтай крымінальнай справы складаюць 33 тамы. На справе праходзяць 9 падсудных і больш за 70 сведкаў. Тым не менш родныя А.Клімава не пакідаюць надзеі на вынясенне справядлівага рашэння па справе іх сына, мужа і бацькі. ■

ЗДАРЭННЕ

Пажар на ЦЭЦ

Мікола ВАЙТОВІЧ

Учора ў Мінску гарэла ЦЭЦ-2. Пажар распачаўся каля 10 гадзінаў раніцы на даху галоўнага корпуса, дзе размяшчаецца цэнтральны пульт упраўлення. Велізарныя клубы дыму ўзняліся над горадам у раёне знакамітай фабрыкі «Камунарка». Падчас тушэння пажару была адключаная трансфарматарная станцыя і спынілася падача электраэнергіі ў Ленінскім раёне горада. Па гэтай прычыне спыніліся тралейбусы, а некаторыя крамы былі зачыненыя. Пажарнікі тушылі агонь напрацягу дзвюх гадзінаў, аднак дахоўку плошчай у дзве тысячы квадратных метраў выратаваць не ўдалося — яна поўнасцю згарэла. Прычыны гэтага надзвычайнага здарэння ўдакладняюцца, аднак, паводле папярэдніх дадзеных, на даху праводзіліся зварачныя работы, якія і прывялі да пажару.

Як стала вядома НАВІНАМ, у раёне ЦЭЦ-2 на працягу тыдня будзе адсутнічаць электрычнасць. ■



Фота ІНЕХ/ProMedia

ЭКСПРЭС-ІНТЭРВ'Ю

Из тени — в свет

Екатерина ВЫСОЦКАЯ

«Первым днем без Лукашенко» назвала оппозиция дату 21 июля. Этот день стал знаковым для 35 депутатов разогнанного Лукашенко Верховного Совета, которые умудрились под носом у президента провести заседание, ставшее эпохальным. В это время эмоционально заряженная толпа ждала своего героя. Спустя сорок минут появился Семен Шарецкий в окружении охраны, сел в джип и... уехал в неизвестном направлении. К собравшимся у здания пяти тысячам вышел Виктор ГОНЧАР и, моментально сориентировавшись в ситуации, возглавил колонну.

В журналистских статьях, на фото и кинопленке, конечно же, останутся все удачи и неудачи этого дня. Но людская память избирательна, в ней сохраняются, как правило, лишь наиболее пафосные моменты. И этим событием станет, безусловно, выход Виктора Гончара в народ. Кто-то уже успел заметить: мол, молодец Гончар, раскручивается по американской модели. Я бы сказала иначе: история дала шанс в этот день именно этому человеку и он не отказался от него.

По следам событий НАВІНЫ задали свои вопросы исполняющему с этого времени обязанности главы Верховного Совета Виктору ГОНЧАРУ.

— Вы согласились стать первым заместителем спикера с условием, что Семен Шарецкий принимает на себя всю полноту власти в стране. Выполнено ли это условие?

— На самом деле условие, которое вы определили как условие к Шарецкому, является программным и связано с видением деятельности Верховного Совета. Если ВС действует как конституционный орган власти, выполняет свои обязанности, вытекающие из Конституции, я действительно согласен возглавлять такой орган. Само собой разумеется, что и Шарецкий в этой ситуации обязан выполнять президентские функции. Относительно ближайших действий Семена Георгиевича я не имею полномочий что-либо сказать, но в ближайшее время будет то, что журналисты называют громким информационным поводом.

— Связано ли это с какими-то новыми назначениями?

— Для того, чтобы перейти к формированию конституционных структур, Шарецкий должен принять на себя обязанности президента. Я думаю, что из характера моего ответа все достаточно ясно.

— Какова юридическая подоплека перехода власти к Семену Шарецкому?

— В соответствии с Конституцией 1994 года, в случае вакансии должности президента исполнение обязанностей президента переходит к председателю Верховного Совета. Соответственно, исполнение обязанностей спикера переходит к первому заместителю председателя Верховного Совета. Поэтому те кадровые рокировки, которые были осуществлены на заседании Верховного Совета, есть необходимая юридическая предпосылка для дальнейшей работы парламента и конкретных должностных лиц.

— Чем будет заниматься мандатная комиссия?

— Что касается мандатной комиссии, то у нее гигантский объем работы, поскольку нам необходимо разобраться с полномочиями каждого депутата ВС, ведь формирование новых структур власти должно быть обсолютно безупречным с юридической точки зрения. Только тогда наши шаги будут сильными и результативными.

— Где сейчас находится Шарецкий? Нет ли угрозы его безопасности?

— В ближайшие сутки в рамках того информационного повода, о котором я говорил, будет полная ясность и по этим вопросам.

— Как получилось, что практически под носом у Лукашенко Верховный Совет смог провести свое заседание?

— Избрание места заседания должно было подчеркнуть уже само по себе силу проводимой политической акции. Что касается «как получилось», то это – очевидное свидетельство возможностей нового руководства Верховного Совета.

— Стояла ли задача 21 июля попытаться отобрать власть у Лукашенко?

— Все практические шаги и действия Верховного Совета будут направлены на реализацию именно этой задачи.

— Что должно произойти со страной, с нами, чтобы власть, пока только номинально перешедшая к оппозиции, реально оказалась в руках демократических сил?

— Только ответственность каждого гражданина перед собой, перед страной может определить реальный переход власти в руки демократических сил. Каждый гражданин виновен в том, говоря словами из последней передовицы НАВІНАЎ, что «уже в течение пяти лет нами управляет воинствующий Хам». Если наши дети проведут свою жизнь в зловонной атмосфере лжи и лицемерия, то это только наша вина. Мы допустили такое развитие событий, и нам эту ситуацию исправлять. ■



Фота Ул. ШЛАПАКА

● **Виктор Гончар** выходит из здания, в котором проходило эпохальное заседание Верховного Совета

ГОЛАС ВУЛІЦЫ

1. Якія якасці павінен мець чалавек, які б змяніў Лукашэнку на пасадзе прэзідэнта?
2. Якога палітыка вы бачыце на гэтай пасадзе?



Таццяна, эканаміст

— Павінен падтрымліваць прадпрымальнікаў, прыватную ўласнасць, гэта перш за ўсё. А то ў нас у гэтым плане сярэдневечча.

— Ну, Шарэцкі, я думаю. Больш асабліва нікога не ведаю.



СОЗІНАЎ Алег, выкладчык

— Прафесіяналізм, папершае, і каб разбіраўся ў эканоміцы і юрыспрудэнцыі, меў досвед, з кага складаць сваю каманду. Не баяўся б крытыкі, і каб на паваротах, як Лукашэнку, не заносіла.

— Калісьці думаў, што Карпенка, пакуль Генадзь Дзмітрыевіч не пайшоў ад нас. Цяпер я такіх не бачу. Хіба што Чыгір.



Вадзім, аператар ЭВМ

— Меншы папуліст, чым Лукашэнка. А таксама гэта павінен быць эканаміст-самазабойца, які будзе расхлёбваць тое, што мы маем цяпер.

— Мне найбольш імпануе Шушкевіч.



Аляксандр, фізік

— Павінен быць рыначнікам, і каб стаяў тварам да Захаду.

— Персонаў, дастойных такой пасады, на жаль, не бачу.



Аляксандр, электроншчык

— Высокаадукаваны, культурны, з вялікім жыццёвым вопытам, і яшчэ — каб меў нармальную сям'ю.

— Я думаю, што дастойным прэзідэнтам быў бы Васіль Быкаў.

Апытвалі Аляксей ШЫДЛОЎСКІ, Уладзімір ШЛАПАК (фота)

МЕРКАВАННІ

Победившие страх

Николай ХАЛЕЗИН, Дмитрий БОНДАРЕНКО

Время «Ч» наступило. Утром 21 июля белорусский президент из легитимного главы государства превратился в гражданина Лукашенко, узурпировавшего власть в стране. Отныне и до проведения новых президентских выборов руководителем страны является Председатель Верховного Совета Семен Шарецкий.

Люди, собравшиеся на Октябрьской площади Минска, а затем переместившиеся к зданию филологического факультета БГУ на улице Карла Маркса, скандировали новый для Беларуси лозунг: «Первый день без Луки!» От страсти, с какой звучали эти слова, в воздухе разливался аромат свободы. В действительности же Лукашенко остался на своем месте, и ему до сих пор подчиняются все институты власти, исполняя приказы сверху. Правда, уже без прежнего рвения.

Роковой для Александра Лукашенко день породил массу вопросов и домыслов – уж больно загадочными выглядели некоторые его события. Если попытаться их проанализировать, то приходишь к выводу, что перспективы ранее легитимного президента не такие уж и радужные, как нас хотят в этом убедить государственные средства массовой информации.

Труба зовет

На площадь в этот раз пришло около 5 тысяч человек. Если сравнивать с 1996 или 1997 годами, то цифра выглядит не такой уж и большой. В те годы уличные акции собирали и 10, и 20 тысяч человек. Но время изменилось. Репрессии, развернутые властями против инакомыслящих, и неразумные действия оппозиции породили депрессию и неверие в свои силы среди политически активного населения. В среду, во время акции, временами казалось, что на улицу вышли совсем другие люди — без страха и рабской печали в глазах. Они противостояли «тихарям», пытавшимся арестовать активистов, поздравляли сотрудников правоохранительных органов с «первым днем свободы» и не прятали глаз от милицейских телекамер.

Единственная ошибка, которую допустили организаторы, — это ставка на рабочее движение, которое пытается возглавить Сергей Антончик. Его бесталанная организаторская работа давно известна в политической среде. Проведенный накануне акции съезд рабочих практически не принес результатов — среди демонстрантов их присутствовало менее полутора тысяч человек.

Если учесть, что акция не была санкционирована властями, проходила в середине июля, когда город практически пуст, а на улице стояла тридцатиградусная жара, то можно быть уверенными, что осенью на подобную акцию может выйти народу в 3-5 раз больше.

Захват

Вопрос, как депутаты оказались в здании филфака БГУ и провели там свое заседание, еще долго будет волновать умы белорусских граждан. На сей счет есть несколько различных мнений. Одни говорят, что служба безопасности, обеспечивающая работу Верховного Совета, с блеском провела операцию по захвату здания; другие утверждают, что помещение было арендовано на подставное лицо; третьи — что власти сами пустили туда депутатов, дабы не было скандала с проведением сессии ВС в Смоленске или Москве. Но в любом случае можно сделать однозначный вывод — кто-то из силовиков уже начал работать против Лукашенко. Ведь если бы у правоохранительных органов возникло желание оккупировать здание на Карла Маркса – они бы это сделали, не встретив адекватного отпора.

Сегодня именно силовые структуры оказались заложниками политики Александра Лукашенко. Невыполнение его приказа влечет за собой немедленное наказание, а выполнение — суровые последствия. Именно поэтому сотрудники органов втайне мечтают о моментальной смене власти.

Преемники

Верховный Совет повел себя мужественно и достаточно точно в сложившейся ситуации. Невнятную позицию продемонстрировала лишь депутат Ольга Абрамова, методично воздерживавшаяся при каждом голосовании. Видимо, сказались российские корни возглавляемой ею партии — Белорусское объединение «Яблоко» (Явлинский-Болдырев-Лукин).

Основная коллизия развернулась вокруг избрания первым заместителем Председателя Верховного Совета Виктора Гончара. За него проголосовали даже те депутаты, которые ранее были непримиримыми оппонентами тактики действий бывшего председателя Центризбиркома. Во время своих выступлений они выражали пожелание Гончару сделать выводы из ситуации, которая сложилась вокруг президентских выборов 16 мая, и учесть допущенные им промахи. Согласие Гончара занять пост первого заместителя напрямую зависело от Семена Шарецкого. Виктор Иосифович поставил условие — он займет этот пост только в том случае, если Председатель ВС примет на себя всю полноту власти в стране. Тогда Гончар становится исполняющим обязанности Председателя Верховного Совета. Именно эта комбинация в итоге и получилась: Семен Шарецкий стал исполняющим обязанности президента, а Виктор Гончар — и.о. Председателя Верховного Совета.

Прогнозировать развитие ситуации, которая сложилась в стране, достаточно сложно. Скорее всего, основными компонентами борьбы за власть станут уличные акции и консультации, проводимые депутатами Верховного Совета с наиболее влиятельными представителями властных структур. А Александру Лукашенко останется лишь наблюдать за всем этим со стороны или пытаться сломать игру оппозиции при помощи долгосрочных переговоров при посредничестве ОБСЕ. Его положению сегодня позавидует разве что покойник – международные структуры заявили о непризнании нынешнего белорусского режима, внутри властных структур смута, а народ побеждает страх. ■

ПОНЕДЕЛЬНИК • 26 ИЮЛЯ



6.30 Доброе утро, Беларусь!
7.00 Новости.
7.10 Доброе утро, Беларусь!
8.15 Резонанс.
9.00 Новости.
9.10 Потребительская корзина. Социально-экономическая программа.
9.25 «Сегодня с вами...» Профессор, кардиохирург Вячеслав Янушко.
9.50 Здоровье. Тележурнал.
10.15 Мультфильмы.
11.00 Новости.
11.10 Новые имена.
11.20 **«Верность любви»**. Сериал.
12.00 Теленавигатор.
12.20 «Что было? Что есть? Что будет?» Док.фильм (ТО «Телефильм»).
13.00 Новости.
13.15 Дневной сеанс. Худ.фильм режиссера Л.Нечаева **«Репетитор»** («Беларусьфильм»).
14.45 Мультфильм.
15.00 Новости.
15.15 Сериал для детей. **«Боишься ли ты темноты?»** (Канада).
15.40 Мультфильмы.
16.10 Сельчане. Минская область.
16.35 Авто-парк.
16.45 Премьера песни.
17.00 Новости (с сурдопереводом).
17.15 «А музыка звучит...» В поисках гармонии.
17.45 «Купалинка». Видеозарисовка («Белвидеоцентр»).
17.50 «Время и люди». Телеочерк о директоре ОАО «Воложинский маслосырзавод» Николае Вечере.
18.10 **«Верность любви»**. Сериал.
18.50 Новые имена.
19.00 Новости.
19.15 Политические диалоги.
19.40 Международные спортивные новости.
20.00 Добрый вечер, Беларусь! В программе: «Разговор в прямом эфире», «Что делать?»
20.25 Юмористическая программа «Понедельник с «Христофором».
20.40 Колыбельная.
21.00 Панорама.
21.40 Событие.
22.00 Худ.фильм по повести Рэя Брэдбери **«Вино из одуванчиков»** (Россия). 1-я серия.
23.10 Криминальная хроника.
23.15 Белорусский хит-парад.
23.20 Третий тайм.
23.50 Новости.
24.00 Мотоспорт. Супербайк-99.



08.00 Новости.
08.15 Сериал **«Во имя любви»**.
09.15 Поле чудес.
10.20 Человек и закон.
11.00 Новости.
13.30 Программа «Вместе».
14.00 Новости.
14.15 **«Гарри - снежный человек»**. Сериал.
14.40 Мультсеанс: «Ну, погоди!»-9.
14.55 Звездный час.
15.30 ...До шестнадцати и старше.
16.00 Сериал **«Во имя любви»**.
17.00 Новости.
17.15 Телесериал **«Графиня де Монсоро»**.
18.15 «Человек в маске».
18.55 Сериал **«Мисс Марпл»**.
20.00 Время.
20.40 Погода.
20.45 Сериал **«Горец - IV»**.
21.40 «Взгляд».
22.20 Худ.фильм **«Васса»**.
23.30 Новости.



06.00 Доброе утро, Россия.
06.20 У всех на устах.
06.45 Телеигра «Программа передач».
08.15 Дежурная часть.
08.45 Товары - почтой.
09.10 **«Миледи»**. Сериал.
10.00 Вести.
15.25 **«Первые поцелуи»**. Сериал.
16.00 Вести.
16.30 «Башня».
17.00 Гомеопатия и здоровье.
17.05 Фильм **«Расстанемся - пока хорошие»**. 1-я серия.
18.25 Диалоги о рыбалке.
19.00 Вести.
19.45 Дневник фестиваля «Славянский базар в Витебске».
20.00 Закрытие VIII Международного фестиваля искусств «Славянский базар в Витебске».
21.45 Акуна матата.
22.50 Дежурная часть.
23.05 Вести.
23.35 Мастер-ралли-99.
00.05 Прогноз погоды.



07.05, 11.30, 13.30, 19.30, 23.00 Новости культуры.
07.25 **«Бал сказок»**. Худ.фильм.
08.30 «Фольклорная весна». Передача 1-я.
09.00 Книжный кладезь.
09.15, 17.40 **«Небо нашего детства»** Худ.фильм.
10.30 Художник М.В.Нестеров.
11.15 «Цветами убранная юность». И.Мирошниченко.
11.40, 20.45 После новостей...
12.00 «Стариковское дело». Спектакль.
13.00 Консилиум.
13.45 «Царская ложа». У.Лопаткина.
14.30 Страна Фестивалия.
15.00, 17.30 Новости.
15.10 «Лукоморье».
15.30 «Владимир Высоцкий». Часть 1-я.
16.35 II Межрегиональный фестиваль экологических телепрограмм.
17.00 Вижу цель!
18.55 «Души моей тревога...» М.Лермонтов.
19.15 Чудо-сказка.
19.50 Док.фильмы. Режиссер В.Левин.
21.05 Бенефис Елены Образцовой.
21.55 «XX век в кадре и за кадром». Иван Пырьев.
22.45 «Pro memoria». «Москва - Берлин».



06.00, 06.30, 07.00, 07.30, 08.00 «Сегодня утром».
06.10, 07.15 Спорт.
06.20 Градусник.
06.25, 07.45, 14.20 Сегодняшко.
19 августа в Минском Дворце спорта состоялся концерт Хулио Иглесиаса. Всемирно известный исполнитель привез в Минск программу «Тур моей жизни», с которой ему затем предстоит побывать в Киеве, Баку, городах Западной Европы и Испании. После выступления Иглесиас нанес дружеский визит Александру Лукашенко. Он был приглашен в президентский дворец. От поездки на «Славянский базар» певец уклонился, несмотря на уговоры Александра Лукашенко. Как пояснил НАВІНАМ его продюсер, это связано и с техническими условиями, и с жесткой программой, которую уже невозможно нарушить.

Хулио прилетел в аэропорт «Минск-2» на собственном самолете. Весь звук, то есть необходимую для выступления аппаратуру, а также артистов, режиссеров, техническую группу и прочее певец привез с собой. Журналисты смогли увидеть и поприветствовать Иглесиаса в зале для дипломатических приемов прямо в аэропорту. Певец попросил репортеров, чтобы они фотографировали его, стоя на стульях. Сам при этом веселился, трепал встречающих за носы, щеки и уверял, что свои песни несет прямо из глубины души. Однако Хулио Иглесиас не разрешил снимать себя во время концерта с близкого расстояния и вообще не пустил телевидение. На вопрос о своем впечатлении от минской публики он ответил возбужденно: «Да, да, все очень замечательно! Я в восторге от этого выступления!»

Организатором концерта была Могилевская филармония, информационным спонсором — Белорусская телерадиокомпания. Могилевская филармония не впервые выступает на арене белорусского шоу-бизнеса, приглашая популярных исполнителей. Однако концерт Иглесиаса для могилевчан стал «выходом на большую воду», несмотря на то, что тот приехал транзитом и уже находится в европейском туре. Нетрудно заметить, что и Хулио Иглесиас, и Могилевская филармония были в Минске гастролерами. Неизвестно, чья группа перевесила по численности: сопровождавшая певца из Испании или из Могилевской филармонии. Только в зале во время концерта могилевчан было около тридцати. Они должны были следить за соблюдением условий контракта, чтобы певца не слепили фотовспышками и не хулиганили. Назойливые фотографы все равно не остановились.

Охотников за автографом Хулио Иглесиаса было неожиданно мало. Видимо, резонанс живого звука распугал привередливых меломанов. Самой заметной фанаткой стала старушка в белом платочке. Держа в руке кошелку, она стучала в окна отправляющегося «ЗИЛа» и требовала: «Уважь бабушку!!!». Хулио хоть и церковный, — так переводится с испанского его фамилия, — а бабушку не уважил... ■


Фота Ул.ШЛАПАКА

● **Хулио Иглесиас** продолжает оставаться популярным испанским певцом. Пик его славы пришелся на 70-80 годы. В 75-м в Европе и Латинской Америке впервые зазвучал его хит «Мануэла». Сегодня романтические интонации шлягера «Натали» известны во всем мире. Он продал свыше ста миллионов своих альбомов.

Свое первое образование Хулио Иглесиас получил в Кэмбриджском университете по специальности право. Потом был голкипером футбольной команды «Реал» (Мадрид) и, может быть, теперь стал бы известным футболистом или адвокатом, если бы не автомобильная катастрофа. В больничной палате он начал играть на гитаре и петь.

ЦЫВІЛІЗАЦЫЯ

Прычыны пацяплення — самалёты

Самалёты будуць усё больш негатыўна ўплываць на клімат нашай планеты. Прычынай гэтага стануць інверсійныя сляды — палосы з крышталаў ільду, якія пакідаюць самалёты ў небе, лічаць спецыялісты з амерыканскага касмічнага агенцтва НАСА.

Пад час даследавання вучоныя прыйшлі да высновы, што гэтыя сляды, паступова пераўтвараючыся ў звычайныя аблокі, садзейнічаюць узнікненню парніковага эфекту на Зямлі.

Сёння доля ўплыву самалётаў на ўзнікненне парніковага эфекту складае каля 1 працэнта, аднак да 2050 года, калі інтэнсіўнасць авіяперавозак значна павялічыцца, гэты паказчык можа ўзрасці ў шэсць разоў. Вывучаючы неба са спадарожніка, вучоныя выявілі, што ў раёнах, дзе праходзіць большасць авіяліній (Еўропа і ўсход Паўночнай Амерыкі), такія штучныя аблокі займаюць адпаведна 3,8 і 5,5 працэнтаў плошчы неба. Да 2050 года гэтая лічба можа павялічыцца ў 10 разоў у Азіі, у 4 разы — у Еўропе і ў 2,6 раза — у ЗША. ■

Гатэль у форме «Тытаніка»

Прадпрымальнікі Лас-Вегаса вывучаюць магчымасць будаўніцтва буйнога забаўляльнага комплексу, які формай і ўнутранымі інтэр'ерамі будзе паўтараць акіянскі лайнер «Тытанік». Гатэль-казіно атрымае назву *Boat* («Карабель»). У ім плануюцца 1.000 нумароў, 1.600 кв.метраў гандлёвай плошчы, канферэнц-зала агульнай плошчай 1.100 кв.метраў і 2.800 кв.метраў рэстаранаў і бараў. Сумарны кошт праекта складзе каля 300 мільёнаў долараў.

Кандыцыянер «Тутанхамон»

Паліцыя іспанскага горада Альмерыа знайшла труп жанчыны, якая памерла два гады таму і дзякуючы ўключанаму кандыцыянеру ператварылася ў мумію. Кандыцыянер працаваў яшчэ дзевяць месяцаў пасля скону яго ўладальніцы, памерлай натуральнай смерцю, прадухіліўшы разлажэнне цела.

Да таго часу, калі камунальныя службы за няўплату адключылі электрычнасць у кватэры памерлай, цела ўжо поўнасцю ператварылася ў мумію. ■

Віягра — бясплатна. Але толькі раз на тыдзень

Брытанскі ўрад прыняў рашэнне, што прэпарат для стымуляцыі патэнцыі — Віягра — будзе бясплатна выдавацца імпатэнтам толькі раз на тыдзень. Гэта прадыктавана эканамічнымі матывамі.

Міністр аховы здароўя Вялікабрытаніі Фрэнк Добсан распаўсюдзіў сярод урачоў спецыяльны цыркуляр, у якім медыкам рэкамендуецца трымацца ўмеранасці пры выпісванні «блакітных таблетак». Усяго ў Вялікабрытаніі налічваецца каля 3 мільёнаў імпатэнтаў. Гэта адзіная катэгорыя людзей, якія карыстаюцца льготамі пры пакупцы Віягры. ■

Залатыя рыбкі — прэзідэнту Казахстана

Японская фірма «Мігумі» падаравала прэзідэнту Казахстана Нурсултану Назарбаеву дэкаратыўных карпаў.

Як паведаміла прэс-служба МЗС Казахстана, згодна з японскай традыцыяй, гэтая рыба сімвалізуе мужнасць, прыгажосць і доўгае жыццё. Японскі падарунак уручаны ў сувязі з пераабраннем Н.Назарбаева на пасаду прэзідэнта.

Уручэнне супала з днём нараджэння кіраўніка Казахстана, якому 6 ліпеня споўнілася 59 гадоў. ■

Падрыхтаваў Ягор ІВАНОЎ

ТЭНДЭНЦЫІ

На погляд масаў

Юры ХАДЫКА, намеснік старшыні БНФ

Вынікі сацыялагічных даследаванняў, што праводзяцца ў краіне незалежнымі аналітычнымі цэнтрамі, становяцца ўсё больш дакладнымі і трывожнымі.

Апраўдаць той факт, што палова беларускага электарата па-ранейшаму падтрымлівае А.Лукашэнку, імкнецца разам з ім «інтэгравацца» ў Расію, можна сотняй важкіх і аб'ектыўных прычынаў. Тут і нізкая палітычная культура, і слабая нацыянальная свядомасць, і дзяржаўная дэзынфармацыя, і свядомая хлусня ў дзяржаўных электронных СМІ. Але тут спрацавалі і шматлікія хібы апазіцыі.



У апытанні, праведзеным у чэрвені Незалежным інстытутам сацыяльна-эканамічных і палітычных даследаванняў, удзельнічала 1.666 рэспандэнтаў (таму адносная памылка не перавышае 3%).

Пракаментаваць усе 50 пытанняў, зададзеных рэспандэнтам, няма магчымасці. Спынюся толькі на тых, што маюць палітычны сэнс. Першае з іх гучыць так: «Якія з пералічаных праблемаў найбольш востра стаяць зараз перад РБ і яе грамадзянамі?» Адказы распадаюцца на тры асноўныя блокі.

Першы (выключна эканамічны): рост цэн — 83%, галеча насельніцтва — 73%.

Другі (дзяржаўніцкі): злачыннасць — 45%, беспрацоўе — 36%, спад вытворчасці — 32%, карупцыя — 30%, Чарнобыль –30%.

Трэці (палітычны): адсутнасць парадку і законнасці – 25%, парушэнне правоў чалавека — 23%, заняпад нацыянальнай культуры — 13%, пагроза РБ з Захаду – 9%, міжнародная ізаляцыя – 9%, раскол грамадства — 5%.

Цікава, што адказы першых двух блокаў закранаюць праблемы, якія А.Лукашэнка абяцаў вырашыць пад час пераможнай для яго выбарчай кампаніі 1994 г., але не здолеў вырашыць, падмануўшы чаканні электарата.

Відавочна, што апазіцыя дзейнічае як раз па накірунках, якія ў грамадскай свядомасці маюць адносна нізкі ранг. Адсутнасць законнасці адзначае толькі кожны чацвёрты, і гэта ёсць максімальная на сённяшні дзень ацэнка падтрымкі апазіцыі, калі яна не зробіць «сваімі» праблемы эканомікі і функцыявання дзяржавы.

Варта звярнуць увагу на лічбы 5 і 13. Пяць працэнтаў апытаных, якія лічаць вострай праблемай раскол грамадства, – гэта ацэнка палітычнай культуры насельніцтва, бо, насамрэч, менавіта раскол грамадства на дзве варагуючыя часткі і ёсць кардынальная праблема Беларусі. Часткі гэтыя прыкладна роўнавялікія. Адна з іх падтрымлівае ўладу і дапамагае ёй падаўляць інтарэсы і памкненні другой, ядро якой складаюць тыя 13%, што лічаць праблемай заняпад нацыянальнай культуры. Гэта – база БНФ. Але паказальна, якой мовай рэспандэнты карыстаюцца: беларускай – 2,5%, рускай і беларускай — 29%, трасянкай – 28%, а ўвогуле — 60% тых, хто не забыў пра сваю нацыянальнасць. З такога пункту гледжання вынікі 10-гадовай дзейнасці БНФ даволі сціплыя, і ўзмацненне адраджэнскай працы застаецца актуальнай праблемай.

Адказы на пытанні, што тычыліся альтэрнатыўнай прэзідэнцкай выбарчай кампаніі, паказваюць, што ў ёй узяло ўдзел толькі 5,3% рэспандэнтаў. Што ў 10 разоў меней, чым паведаміў В.Ганчар. У 10 разоў меней, чым колькасць людзей, якія былі гатовыя прыняць удзел у выбарах (пра гэта сведчылі ранейшыя сацыялагічныя апытанні). І ў 5 разоў меней, чым апазіцыйны электарат. Вынікі, паведамленыя В.Ганчаром, не проста фальсіфікацыя. Гэта – надта грубая фальсіфікацыя. Асабліва крыўдная таму, што ў ёй не было ніякага палітычнага сэнсу.

Але такі жахлівы разрыў і нявыкарыстаныя магчымасці ёсць вынік заклікаў З.Пазьняка да выбараў у адзін дзень і справакаванага ім развалу часткі выбарчых камісіяў. Так што адказнасць за фантастычную лічбу 53% ляжыць на В.Ганчары, адказнасць за 5,3% – на тых, хто зрываў выбары.

Пра гэта сведчыць і тое, што пераважная большасць апытаных выпрацавала персанальнае стаўленне да кандыдатаў апазіцыі ды іхных шанцаў перамагчы А.Лукашэнку. Вынікі сумныя. Пры канкурэнцыі пары *А.Лукашэнка – М.Чыгір* на сённяшні дзень у выбарах прыняло б удзел 74% выбаршчыкаў. Пры гэтым за Лукашэнку прагаласавалі б 52%, за Чыгіра — 11%, супраць абодвух — 11%. У пары *А.Лукашэнка – З.Пазьняк* лічбы адпаведна 53%, 6,5% і 15%. У пары *М.Чыгір – З.Пазьняк* яны складаюць: за Чыгіра 12,1%, за Пазьняка 5,8%, супраць абодвух 39%.

Аб чым гавораць гэтыя лічбы? У тым выпадку, калі Лукашэнка раптоўна прызначыць прэзідэнцкія выбары, чаго выключаць нельга, апазіцыя не мусіць выстаўляць аднаго кандыдата. Рацыянальная выбарчая стратэгія апазіцыі павінна быць у тым, каб вылучыць супраць А.Лукашэнкі ад 3 да 5 апанентаў, каб максімальна скарыстаць час перадвыбарчага змагання і адцягнуць ад ППРБ як мага больш галасоў. Задача гэта значна складанейшая, чым вылучыць аднаго кандыдата. Яна патрабуе адзінства і скаардынаванасці дзеянняў апазіцыі, адмовы ад асабістых амбіцыяў.

Згаданыя лічбы сведчаць і пра катастрафічна нізкі рэйтынг З.Пазьняка. Ён хоць і ўзрос з 3,4% да 6,5% у выніку мінулай кампаніі, аднак ахоплівае толькі палову патэнцыйных прыхільнікаў БНФ. Апісаная тактыка магчымых выбараў з удзелам А.Лукашэнкі вымагае ад кандыдата БНФ здольнасці да кампрамісу і абавязковага трымання слова – якасцяў, якіх З.Пазьняку як раз не хапае. Таму перад БНФ у бліжэйшы час паўстане дылема — альбо падтрымаць каго-небудзь з апазіцыйных кандыдатаў, альбо вылучаць ад сябе новую кандыдатуру.

Нарэшце, на пытанне «Якім чынам можна эфектыўней за ўсё ўздзейнічаць на ўлады РБ?» 26% адказалі «праз выбары», 15% — «праз страйкі», 9% – «праз узброеную барацьбу», 13,5% — «праз мітынгі, дэманстрацыі, пікеты». Ізноў гэтыя магічныя 13%. Нават калі забыць, што Мінск настроены больш дэмакратычна і рашуча, чым астатняя краіна, гэта азначае, што каля 140 тысяч гатовыя падтрымаць масавыя акцыі пратэсту. Мы ж выводзім на дэманстрацыі ў лепшым выпадку адну дзесятую частку пратэстнага электарата. Гэта адначасна і ацэнка эфектыўнасці нашай тактыкі і арганізацыйных магчымасцяў, і папрок, і задача, невырашальная да тых часоў, пакуль у нас будуць панаваць сектанцкія настроі.

Прыведзеныя дадзеныя пераканаўча сведчаць пра жыццёвую неабходнасць аб'яднання апазіцыйных сілаў, спыненне раздражнёнай і неабгрунтаванай крытыкі, паляпшэнне адносінаў з незалежнай прэсай. І, зразумела, падтрымкі Вярхоўнага Савета, а не падрыву яго легітымнасці. ■

ЗАМЕЖЖА

Лукашенко лишается фактического международного признания

Окончание. Начало на стр.1

Например, мы достигли прогресса касательно резиденции посла. Напомню, что посол Спекхард был отозван именно потому, что правительство Беларуси отобрало его резиденцию. Мы начали обсуждать вопрос компенсации убытков с белорусским правительством. Если все будет нормально, это даст нам возможность вернуть посла Спекхарда в Минск на какое-то время. Итак, мы будем поддерживать с ними контакты на уровне де-факто. На мой взгляд, дальше уже просто некуда.

— Значит ли это заявление, что США больше не считают Лукашенко президентом?

— Да.

— С сегодняшнего дня?

— Со вчерашнего, когда было сделано заявление.

В то же время представитель Российского МИД Борис Рахманин заявил, что у **России** нет оснований сомневаться в легитимности Лукашенко после 20 июля, поскольку на референдуме 1996 года более 70 процентов населения высказались в его поддержку.

Таким образом, внешнеполитические ведомства США и России дали диаметрально противоположные оценки историческому событию белорусской истории. Совсем недавно такие же резкие расхождения в позициях России и США наблюдались в связи с ситуацией в Косово.

Министр иностранных дел **Украины** Борис Тарасюк также сделал заявление в связи с 20 июля, подчеркнув, что украинско-белорусские отношения после 20 июля не претерпят изменений. Эта обычная украинская невнятная позиция свидетельствует о том, что нынешнее руководство Украины не готово выступать с позиций демократического государства без оглядки на свое советское прошлое. Однако прошедшие в Киеве пикеты у белорусского посольства продемонстрировали, что у демократической Беларуси есть поддержка и среди украинской общественности.

Разноречивые заявления были сделаны в связи с 20 июля польским МИД. Если министр иностранных дел **Польши** Бронислав Геремек отметил необходимость отношений с Беларусью, то представитель МИД Павел Добровольский заявил, что после 20 июля ни Лукашенко, ни другие официальные лица не будут приниматься в Польше на официальном уровне.

По последней информации, к заявлению **Председателя Евросоюза** от 20 июля присоединились ассоциированные страны Центральной и Восточной Европы, Кипр, Мальта, страны-участницы Европейского соглашения о свободной торговле, участники Европейской экономической зоны, Исландия и Лихтенштейн.

Координатор Хартии'97 по международным связям **Андрей Санников** так прокомментировал заявление Евросоюза:

— Очень важно, что это заявление было сделано именно 20 июля и в связи с этой датой. Несмотря на активные попытки белорусских властей — МИДа и других ведомств — «замолчать» факт завершения полномочий Лукашенко, ЕС сделал на нем смысловой акцент. Кроме того, в заявлении в связи с 20 июля выражена поддержка демократическим силам и желание строить свои отношения с демократической страной.

Подчеркнув известную позицию о признании государств, а не отдельных руководителей, ЕС отметил те критерии, которые позволяют развиваться нормальным отношениям с государствами. То есть признание не означает нормализации отношений, если государство идет по антидемократическому пути.

Что касается диалога властей с оппозицией, о котором в последнее время говорят как о единственной возможности выхода из тупика, то в заявлении ответственность за начало диалога непосредственно возложена на Лукашенко. Кроме того, в нем подчеркнуто, что голословным заявлениям Лукашенко веры нет, если за ними не последуют реальные действия. В целом заявление демонстрирует более серьезный подход ЕС к ситуации в Беларуси и хорошее понимание этой ситуации. ■

Пикеты возле посольств

Иван БАБИЧЕВ

Пикеты, отмечающие окончание президентских полномочий Александра Лукашенко, прошли в нескольких европейских столицах 20 и 21 июля.

Брюссель

Пикетирование проходило 20 июля с 11 до 13 часов перед белорусским посольством. Акцию организовало европейское представительство Хартии'97. В пикете приняло участие 25 человек — главным образом, белорусские политические беженцы, проживающие ныне в Бельгии. Среди них были даже несколько женщин с маленькими детьми. Среди множества плакатов особенно ярко выделялись «Остановить политические убийства в Беларуси!», «Нет русской оккупации!», «Лука, учись считать, 1994+5=1999». Выкрикивались лозунги — «Преступника — в тюрьму!», «Дурня — в колхоз!», «Свободу политзаключенным!» и множество других.

Варшава

Пикет также прошел 20 июля перед белорусским посольством. Акция была организована Информационным центром Верховного Совета в Варшаве вместе с польскими «Молодыми демократами». Она прошла под лозунгами «Народ имеет право!» и «Свободная Беларусь!» Манифестация привлекла повышенное внимание журналистов — ее ход освещали три польских телеканала, журналисты мировых информационных агентств. Свои песни присутствующим спел белорусский бард Андрей Мельников, специально пришедший для этого на акцию. Манифестанты потребовали свободных выборов в нашей стране и скандировали «Живе Беларусь!»

Вильнюс

Пикетчики пришли к белорусскому посольству в 13 часов 21 июля. Организовало акцию Товарищество белорусской культуры в Литве. Около 50 членов белорусских организаций в Литве под бело-красно-белыми флагами и плакатами участвовали в этом пикете. Акция привлекла внимание большого количества простых граждан, которые проходили мимо. Они высказывали пикетчикам свою солидарность. Представителям посольства было передано открытое письмо к Лукашенко, подписанное участниками пикета. ■

ВІРТУАЛЬНЫ ПРАТЭСТ

Интернет выносит приговор Лукашенко

Олег БЕБЕНИН

Широкомасштабная виртуальная акция протеста была развернута в эти дни пресс-центром Хартии'97. Дате 20 июля были посвящены специальные баннеры – объявления с информацией о конце легитимного срока правления президента Лукашенко. Они были размещены на нескольких десятках веб-сайтов различной тематики. Посетители www.charter97.org могли знакомиться также с правовой информацией, обосновывающей, почему президент должен уйти. На сайте были вывешены также листовки и запрещенная газета «Народный президент», которые распространялись в Беларуси в эти дни.

Кульминацией акции стали виртуальное голосование по вопросу «Президент должен уйти на...» и прямая трансляция событий 21 июля. Более 600 человек следили в среду за акцией протеста на минских улицах.

В голосовании, которое длилось три дня, участие приняло около 300 человек. Для Лукашенко их приговор однозначен – под суд (102 голоса). Один даже добавил – «желательно, под суд Линча».

39 человек послали президента в отставку и 36 – домой. 7 раз ему «рекомендовали» уехать в Россию. Географически Лукашенко также посылали в Сербию, Ирак, в Рыжковичи, на Колыму и даже « в Антарктиду перед пингвинами и телекамерами выступать». В качестве нового занятия экс-президенту предложено избрать профессию председателя колхоза и управдома.

Большой процент участников голосования выбрали очень резкие формулировки «пожелания» Лукашенко. Его «посылали» в полном соответствии с табуированной лексикой русского языка около сотни раз. Причем в очень разнообразной форме. Этому способствовала полная анонимность отправителей, обеспеченная техническими способами. Весьма философски звучали фразы типа «Иди в небытие» или эмоционально – «Скотина, пять лет мне испортил. Как ты, сволочь, мне мои деньги вернешь», «А тебе некуда идти, козел усатый! Тебя везде достанут!» или «Пшел вон с моей страны!» С Украины пришло «Українці кажуть: Президент, іди до Біса!!! Не мордуй наших братів-слов`янів!» Для того, чтобы все эти пожелания дошли до Александра Лукашенко, их копии автоматически отсылались на его адрес электронной почты. ■

памяць XX стагоддзя 1913

Сацьяграха, ці непадпарадкаванне

Міхал МАТУШ

У се высокаразвітыя дзяржавы стварылі сваё нацыянальнае багацце дзякуючы каланіяльнай эксплуатацыі блізкіх ці далёкіх тэрыторыяў. Прыкладам, Амерыка ўздымалася праз рабскую працу афрыканскіх нявольнікаў, Расія эксплуатавала народы Сібіры, ханствы і халіфаты Сярэдняй Азіі і г. д. Францыя старанна выціскала сокі з Алжыра. Эканамічная моц Англіі на працягу двух стагоддзяў сілкавалася рабаўнічымі здабыткамі ў Індыі. Невыпадкова тыповы сюжэт англійскай літаратуры — як суполка індыйцаў прыбывае ў Лондан, каб вярнуць на радзіму каштоўныя рэліквіі, скрадзеныя ў будыйскіх храмах. Дастаткова перачытаць апавяданні пра Шэрлака Холмса, каб у гэтым пераканацца.

Індыя — шматнацыянальная краіна, тут людзі гавораць на 187 мовах, пры гэтым 23 мовы ўжываюцца народамі, кожны з якіх налічвае болей 1 мільёна чалавек. Тры чвэрці насельніцтва належаць да індаеўрапейскай моўнай сям'і, а на поўдні краіны пераважаюць дравідскія народы. На пачатку стагоддзя гэта моцна перашкаджала аб'яднаўчаму працэсу ў грамадстве дзеля барацьбы за самастойнае існаванне Індыі.

У 1913 годзе індыйскі пісьменнік Рабіндранат Тагор атрымаў Нобелеўскую прэмію. Гэтая падзея паўна здолела перамагчы брытанскую адміністрацыю.

Калі Гандзі вярнуўся на радзіму, у яго ўжо была выпрацаваная і апрабаваная тактыка сацьяграхі — негвалтоўнага супраціўлення. Праз некалькі год ён стаў найбольш вядомым лідэрам партыі Індыйскі нацыянальны кангрэс. У 1919—1922 гадах Гандзі ўзначальвае першыя акцыі сацьяграхі, накіраваныя супраць англійскага панавання. Агульнанацыянальная кампанія несупрацоўніцтва з англічанамі пачалася 1 жніўня 1920 года. Гандзі заклікаў індыйскі народ байкатаваць каланіяльную адміністрацыю, англійскія тавары, адмаўляцца ад службы ў органах кіравання, не прымаць урадавыя ўзнагароды. Абвінавачаны ў закліках да мяцяжу, ён трапіў за краты. Наогул Гандзі сядзеў у турме тройчы (1922—1924, 1930—1931, 1942—1944). Апошні турэмны тэрмін ён атрымаў за вылучаны ім антыанглійскі лозунг «Прэч з Індыі!», які быў падтрыманы партыяй і народам.

Гандзі дажыў да таго дня, калі Індыя пасля Другой сусветнай вайны атрымала незалежнасць. Аднак у сувязі з тым, што англічане, пакідаючы Індыю, зрабілі ўсё магчымае, каб падзяліць краіну па рэлігійных адметнасцях на дзве, адасобіць мусульманскі Пакістан, Гандзі не адчуў радасці ад набытай такім чынам самастойнасці. Гандзі



Махандас Гандзі з жонкай Кастурбай. 1913 год

плывала на выпрацоўку нацыянальнай ідэалогіі інтэлектуальнай элітай і падштурхнула да вяртання на радзіму такую буйную асобу індыйскай гісторыі, як Махандас Гандзі. Наступныя трыццаць чатыры гады ён быў духоўным правадыром Індыі, найвышэйшым маральным аўтарытэтам, а нададзенае яму ў народзе імя — Махатма (Вялікая душа) — адлюстроўвае яго месца ў нацыянальна-вызваленчым руху.

Гандзі нарадзіўся ў 1869 годзе ў заможнай сям'і (яго бацька займаў пасаду міністра ў княствах паўвострава Катхіявір). Па традыцыі Гандзі ў 13 гадоў ажаніўся (дарэчы, яго першыя дзве нявесты памерлі, са сваёй будучай жонкай ён быў абручаны ў 7 гадоў). Вышэйшую адукацыю Гандзі атрымаў у Лондане, пасля займаўся адвакацкай практыкай, а з 1893 года быў юрыдычным кансультантам індыйскай гандлёвай фірмы ў Паўднёвай Афрыцы. Тут індыйцы лічыліся людзьмі другога гатунку (негры — апошняга), і Гандзі ўзначаліў пратэсты супраць расавай дыскрымінацыі. Праз грамадзянскае непадпарадкаванне індыйская абшчына

лічыў, што рэлігійны падзел некалі адгукнецца вялікімі непрыемнасцямі. (Пра справядлівасць яго ных прадчуванняў сведчаць пастаянныя памежныя канфлікты паміж Індыяй і Пакістанам.) Косная думка фанатыкаў не магла спасцігнуць ні ягонай мары, ні ягоных прынцыпаў. Пасля некалькіх нападзенняў на яго жыццё Гандзі ў студзені 1948 года быў забіты тэрарыстам з індуісцкай шавіністычнай арганізацыі.

Унікальны духоўны свет Індыі патрабаваў унікальнай асобы, здольнай улічыць псіхалогію сотняў мільёнаў людзей, арыентаваных з прычыны рэлігійных перакананняў на негвалтоўныя адносіны да іншых, стварыць філасофію і практыку грамадзянскага непадпарадкавання, якое паспрыяла вызваленню краіны з-пад каланіяльнага прыгнёту. Стваральнік Махатмам Гандзі стратэгія грамадзянскага непадпарадкавання сёння, пад канец стагоддзя, выкарыстоўваецца мноствам арганізацыяў у розных краінах свету, а сам Гандзі стаў узорам высакароднасці і чысціні ў палітыцы, неўміручым сімвалам духоўнай магутнасці Індыі. ■

У Беларусі — 150 тысяч нелегальных мігрантаў

Юрый ПАЦЁМКІН

Паводле ацэнак Камітэта па міграцыі пры міністэрстве працы, у Беларусі знаходзяцца ад 100 да 150 тысяч нелегальных мігрантаў.

Праблема нелегальнай міграцыі ўзмацняецца тым, што яна стала даходнай для махляроў, якія кантрабанду мігрантаў у заходнія краіны ператварылі ў даволі прыбытковы бізнес. Падобныя крымінальныя групы актыўна дзейнічаюць і на тэрыторыі Беларусі. Яны цесна звязаныя з іншымі злачыннымі супольнасцямі, што дзейнічаюць па ўсім свеце. У прыватнасці, былі названыя Расія, Польшча, Германія, ЗША, Данія, Нарвегія і Швецыя. Паводле звестак з Камітэта па міграцыі, перакіданне нелегальных мігрантаў у ЗША каштуе да 20 тысяч долараў ЗША, у Германію — 12 тысяч, у Швецыю — 10 тысяч, у іншыя, менш прыцягальныя краіны — ад 3 тысяч долараў ЗША. Асабліва неспрыяльны ўплыў на міграцыйнае становішча ў Беларусі аказвае «празрыстасць» беларуска-расійскай мяжы. Гэта дазваляе нелегальным мігрантам — у асноўным, з краінаў Афрыкі і Азіі — праз Таджыкістан і Расію практычна бесперашкодна пранікаць у Беларусь. Толькі за апошнія некалькі гадоў у Беларусі перакрытыя 63 каналы перакідвання нелегальных мігрантаў; затрымана 12 яго арганізатараў, у якіх у агульнай складанасці канфіскавана каля 100 кілаграмаў наркатычных рэчываў. ■

ВЕРСІЯ


Робин Гуд был геем?

Елена БЕЛОВА

Пантеон героев-гомосексуалистов может увеличиться. Профессор английской литературы Стивен Найт из Кардиффского университета пришел к выводу: оригинальные баллады XV века позволяют предположить большую склонность легендарного разбойника к мужской веселой компании, нежели к прекрасному полу. «В балладах он открыто не описывается как гомосексуалист из-за морального климата той эпохи», — подчеркивает ученый. Но, по его мнению, гомосексуальные тенденции банды Робин Гуда вполне очевидны. «Робин и его команда жили в мужском обществе, в котором не было места для женщин», — заключает профессор.

По его оценке, главный женский персонаж легенды о Робин Гуде — прекрасная леди Марианна — появляется впервые в более поздних версиях легенды, примерно в XVII веке. Установившиеся тогда моральные нравы однозначно требовали от положительного героя гетеросексуальной любовной истории.

Точка зрения Стивена Найта вызвала противоречивые оценки коллег. Однако некоторые специалисты призывают внимательнее рассмотреть его выводы, вписывая их в контекст того времени. Например, профессор истории средних веков из Кэмбриджского университета Барри Худ отмечает, что в XII веке, когда будто бы жил Робин Гуд, гомосексуализм был допустимой нормой поведения. Но уже столетие спустя церковь перестала терпеть однополую любовь. ■



INTERNET

Если конец света все-таки случится, то...

«Зететический кружок» посвятил свой сайт в Интернете полному разрушению Парижа, которое должно произойти в результате наступившего Апокалипсиса, предсказанного Нострадамусом. Известный кутюрье Пако Раббан на основании «Центурий» Нострадамуса вычислил, что разрушение Парижа произойдет 11 августа этого года в 11 часов 20 минут.

Кружок, получивший название от греческого «зететин» - «искать», намеревается вести расследования и информировать общественность об аномальных явлениях. На сайте (www.zetetique.ldh.org) имеется приглашение всем выжившим после Апокалипсиса явиться на аперитив. При этом место встречи не указывается. ■

Оперу можно послушать в Интернете


Любителям оперы теперь не обязательно выходить из дома, чтобы послушать любимые арии. Классическая опера выходит в Интернет. Компания IBM поместила по адресу www.ibm.com/it/aida запись оперы «Аида», сделанную во время 77-го оперного фестиваля в Вероне.

Несмотря на то, что изображение довольно низкого качества, а звук часто не соответствует движениям певцов, у некоторых специалистов это событие вызвало волну энтузиазма.

С другой стороны, ведущий форума по классической музыке Дэвид Манн так выразился по поводу этого нововведения: «Слушать музыку через динамик компьютера — это все равно что принимать ванну в носках». ■

Подготовил Егор ИВАНОВ

ФОТАФАКТ



Мужицкое счастье: был бы милый рядом...

СПОРТ

«Кубок Свободы» памяти Геннадия Карпенко

Пресс-центр БАМП

Третий год подряд Белорусская Ассоциация молодых политиков (БАМП) в канун Дня Независимости проводит турнир по мини-футболу. С этого года ставший уже традиционным «Кубок Свободы» получает печальное дополнение: «памяти Геннадия Карпенко». Геннадий Дмитриевич был непременным участником предыдущих турниров. Он был предан его величеству футболу и очень хотел видеть Беларусь суверенным процветающим государством. «Кубок Свободы» — это память о человеке, о спортсмене, о политике.

В соревнованиях примут участие команды, представляющие ОГП, БНФ, БСДП (НГ), сборная «Молодая Беларусь», сборная журналистов, команда г. Витебска. На футбольное поле выйдут известные политики и журналисты. Это Геннадий Тереня, Павел Знавец, Анатолий Лебедько, Лявон Барщевский, Виктор Гончар, Юрий Беленький, Владимир Новосяд, Владимир Дорохов, Александр Старикевич.

Игры пройдут в субботу, 24 июля, на мини-футбольной площадке в парке Челюскинцев. Открытие турнира в 9:30. Предполагается, что его откроет Людмила Филипповна Карпенко. ■

КАНФЛІКТ

УНА-УНСО мае намер перашкодзіць планам маскоўскага патрыярха Аляксія II

БелаПАН—УНІАН

Праварадыкальная украінская арганізацыя УНА-УНСО абвясціла мабілізацыю грамадзянаў Украіны для стварэння групаў, якія будуць супрацьстаяць «хрэснаму ходу», які ініцыіруе маскоўскі патрыярх Аляксій II. «Хрэсны ход» павінен распачацца напачатку жніўня і прайсці праз такія гарады Украіны, як Марыупаль, Севастопаль, Запарожжа, Днепрапятроўск, Чаркасы, Канеў, Кіеў і Чарнобыль.

Актывісты УНА-УНСО, у прыватнасці, плануюць арандаваць цягнік, аўтобусы і сустрэць «хрэсны ход» у Марыупалі, на украінска-расійскай мяжы. Тлумачачы сваё непрызнанне маючай адбыцца акцыі, кіраўнікі УНА-УНСО адзначаюць, што на апошніх выбарах прэзідэнта Расіі маскоўская царква падтрымала камуніста Генадзя Зюганава. Такім чынам, робіць высnову УНА-УНСО, гэта сведчыць аб тым, што «маскоўская царква з'яўляецца дзяржаўным інструментам маскоўскай імперыі». ■

© НАВІНЫ. Спасылка на газету НАВІНЫ абавязковая. Рэдакцыя можа не падзяляць меркаванні аўтараў, публікаваць артыкулы дзеля палемікі Адрас: г.Мінск, пр-т газеты «Известия», 8-173. Пасведчанне аб рэгістрацыі № 996
Выдаецца з 16 студзеня 1998 г. В.а. галоўнага рэдактара і заснавальнік Павел Жук. Выдавец — рэдакцыя газеты НАВІНЫ. Адрас для карэспандэнцыі: 220034, г. Мінск, вул. З.Бядулі, 6-47. Тэл./факс: 236-89-40.
E-mail: NPSvaboda@irex.minsk.by Надрукавана на паліграфічнай фабрыцы «Чырвоная зорка» (г.Мінск, 1-шы Загарадны завулак, 3) Заказ 575 Нумар падпісаны ў друк 22/07/99 (15:00) Наклад — 21.050